ленность. Эмоциональный настрой на уроке, эмоциональная подача учебного материала педагогом, включение учащегося в игру, диалог, беседу, работа над упражнениями и тренингами – наиболее эффективные приемы развития эмоциональности на учебных занятиях.

1. *Минаева, В. М.* Развитие эмоций дошкольников. Занятия. Игры : пособие для работников дошкольных образовательных учреждений / В. М. Минаева. – М. : АРКТИ, 2001. – 44 с.

2. *Поплянова, Е. М.* Игровые каноны на уроках музыки [Ноты] / Е. М. Поплянова. – М. : Владос, 2002. – 78 с.

3. Работа с детским хором : сб. ст. / под ред. В. Г. Соколова. – М. : Музыка, 1981. – 69 с.

4. *Саенко, Ю. В.* Регуляция эмоций: тренинги управления чувствами и настроениями / Ю. В. Саенко. – СПб. : Речь, 2011. – 222 с.

УДК: [398.341:636.76/.8]+7.04.2(476)

***А. М. Нароўская,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

## МІФАПАЭТЫЧНАЯ СІМВОЛІКА ЖЫВЁЛ ПРЫ ПЕРАХОДЗЕ Ў НОВЫ ДОМ

**Анатацыя.** Разглядаецца абрад пераходу ў новы дом. Прыводзяцца звесткі пра нейтралізацыю небяспечнай семантыкі неасвоенага жылля. Даследуюцца будаўнічыя абрады, у якіх жывёла выступае як адзін з варыянтаў міфалагічнага кода. Аналізуецца сімволіка жывёл у будаўнічых абрадах.

**Ключавыя словы:** дом, жыллё, семантыка, сімвал, абрад.

***A. Narouskaya,***
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department*
*of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution*
*"The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## MYTHOPOETIC SYMBOLISM OF ANIMALS DURING THE TRANSITION TO A NEW HOME

**Abstract.** The article discusses the rite of passage to a new home. The article provides information on neutralizing the dangerous semantics of unbuilt housing, studies construction rituals in which the animal acts as one of the variants of the mythological code, and analyzes the symbolism of animals in construction rituals.

**Keywords:** house, dwelling, semantics, symbol, rite.

У міфалагічнай сістэме ўяўленняў беларусаў новы дом меў амбівалентную характарыстыку. Ён яшчэ не заняў адпаведнага месца ў станоўчым ці адмоўным радзе ўніверсальнай класіфікацыі, пры дапамозе якой чалавек арыентаваўся ў прасторы. З аднаго боку, новы дом разглядаўся як аб’ект, які яшчэ небяспечны для людзей: ён новы, у ім яшчэ ніхто не спаў. З іншага боку – дом ужо выдзелены з прыроды і пабудаваны для пражывання ў ім сям’і.

Нейтралізацыі небяспечнай семантыкі неасвоенага жылля былі прысвечаны спецыяльныя абрады, сярод іх важнейшы – пераход у новы дом. Канцэпцыя гэтага дзеяння была ўпершыню сфармулявана А. ван Генепам, паводле вызначэння якога абрад пераходу – гэта паслядоўнасць дзеянняў, што суправаджаюць пераход з аднаго стану ў іншы, з аднаго свету (касмічнага ці грамадскага) – у іншы [2, с. 9]. У энцыклапедыі таксама адзначаецца, што тэрмін «абрад пераходу» выкарыстоўваецца для апісання асноўных момантаў у жыцці чалавека (радзінныя, вясельныя і пахавальныя абрады). У час правядзення гэтых рытуалаў змяняецца сацыяльны статус і чалавек з аднаго стану пераходзіць у іншы. Да пераходных таксама адносяцца абрады, якія суправаджаюць перамену месцажыхарства. Міфапаэтычнае мысленне чалавека было звязана з бінарнымі прынцыпамі, дзякуючы якім адбываецца класіфікацыя важнейшых аб’ектаў макра- і мікрасвету. Асноўнай была апазіцыя паміж космасам і хаосам, а менавіта, паміж жыццём і смерцю. Асвоеная культурная ўпарадкаваная прастора сімвалізавалася рознымі выявамі: слупам, храмам, жыллём, якія супрацьстаялі хаосу.

Гэтыя ўяўленні аб міраўладкаванні актуалізаваліся ў сферы рытуалу, які павінен быў спрыяць усталяванню парадку, створанаму ў архаічныя, міфічныя часы. Паўтарэнне першапачатковага міфа павінна было аднавіць мірапарадак у часе.

Пераходныя абрады мелі два аспекты: узроставы і сацыяльны. Яны аб’ядноўвалі ўяўленні пра такія бінарныя супрацьлегласці, як жыццё і смерць, да якой прыраўноўвалася страта

чалавекам яго ранейшага сацыяльнага статусу. Абавязковым атрыбутам рытуалаў было ахвярапрынашэнне як жывёл, так і асацыіраваных з імі старажытных рытуальных прадметаў.

Жывёлы як сімвалы сустракаюцца на ўсіх этапах будаўніцтва традыцыйнага жылля беларусаў. Згодна этнаграфічным крыніцам можна выдзеліць тры моманты выкарыстання жывёл у будаўнічай абраднасці: 1) жывёла – індыкатар пры пошуку месца для будаўніцтва дома; 2) жывёла – ахвяра пры будаўніцтве жылля; 3) жывёла – замена гаспадара пры пераходзе ў новы дом.

Будаўнічы абрад можна разглядаць як адзін з ключавых, што абумоўлена выключнай роллю жылля ў сістэме ўспрымання свету. Як паказаў аналіз літаратурных крыніц, найбольшая колькасць матэрыялаў па будаўнічай абраднасці, звязанай з жывёламі, выяўлена ў Віцебскай, Гродзенскай, Гомельскай абласцях. Пры напісанні артыкула выкарыстоўваліся публікацыі этнографаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. А. Е. Баградановіча, Ю. Ф. Крачкоўскага, М. Я. Нікіфароўскага, Н. М. Нікольскага, П. В. Шэйна, а таксама матэрыялы этнаграфічных экспедыцый аўтара.

Этнографы канца XIX ст. спрабавалі патлумачыць ахвярапрынашэнні зыходзячы з трактоўкі, што гэта ахвяра духам зямлі. На іх думку, душа ахвяры становіцца духам-ахоўнікам будынка. Аднак, на думку Д. К. Зяленіна, звычай мае нашмат больш глыбокія і старажытныя карані. Ён сягае ў тыя часы, калі пабудовы ўзводзіліся пераважна з дрэва, стаўленне да якога было як да татэма. Паколькі рубка дрэў для будаўніцтва была парушэннем недатыкальнасці татэма, то дрэвы маглі пакараць будаўнікоў або першых гаспадароў будынка смерцю. Каб пазбегнуць гэтай долі, будаўнікі папярэджвалі помсту і загадзя прыносілі ахвяру [3, с. 147–148].

У этнаграфічнай літаратуры ёсць і іншыя тлумачэнні. Так, напрыклад, А. Афанасьеў адзначае, што «дом не інакш можа быць пабудаваны, як на галаву аднаго з тых, хто будзе жыць у ім» і што «ні адзін дом не можа стаяць без аховы яго сцен радавым пенатам». З «радавым пенатам» (паводле Дж. Фрэзера, духамі) звязваецца цэлы комплекс народных прымет. Вось што піша А. Афанасьеў: «... новазбудаванае жыллё тады толькі будзе трывалым, калі памре гаспадар... і дом у асобе

душы нябожчыка атрымае свайго ахоўніка, свайго дамавіка». Існавала павер'е, што пабудова новага дома цягне за сабою смерць гаспадара [1, с. 83].

Аднак, паводле вераванняў сялян, чалавечай смерці пры пабудове жылля можна пазбегнуць. Для гэтага трэба прынесці ў ахвяру якую-небудзь жывёлу. Прычым у розных месцах былі свае асаблівасці. Так, па звестках М. Я. Нікіфароўскага, у Віцебскай губерні лічылі, што цясляр можа заклясці чыё-небудзь жыццё пры рубцы першага вянца [6, с. 136]. У Гродзенскай губерні беларусы «верылі, што пры рубцы першых бярвён будучага дома цясляр абавязкова каго-небудзь заклінае – ці з ліку членаў сям'і гаспадара дома, ці хатнюю жывёлу, напрыклад, каня, карову і г. д.» [4, с. 35]. На тэрыторыі каля Лепеля і Барысава пры закладцы новага дома адсякалі галаву пеўню, якую і зарывалі ў зямлю ці проста клалі пад кутні камень; пеўня з'ядалі.

Ахвярапрынашэнні пры будаўніцтве жылля былі зафіксаваны паўсюдна на тэрыторыі Беларусі. У якасці будаўнічай ахвяры магла быць і галава каня, якую зарывалі пры закладцы падмурка жылля. М. М. Нікольскі піша, што яшчэ ў XIX ст. былі ахвярапрынашэнні пеўня, курыцы, дробнай жывёлы, на змену якім прыйшла бяскроўная ахвяра [7, с. 14].

Такім чынам, рытуалы, звязаныя з ахвярапрынашэннямі жывёл, яшчэ больш пашыраюць нашы ўяўленні пра ролю жывёл у сакральнай сферы і міфалагічныя значэнні тых альбо іншых іх відаў. У міфапаэтычных тэкстах жывёла выступае як адзін з варыянтаў міфалагічнага кода, на аснове якога могуць з'яўляцца цэлыя паведамленні [5, с. 440–441]. Так, напрыклад, певень быў звязаны з культам продкаў, выступаў як будаўнічая ахвяра замест гаспадара. Асацыяцыя пеўня з гаспадаром дома бачна ў прымеце: калі певень «падманвае» курэй, клічучы іх марна, то ў гэты час нехта падманвае ці абгаворвае гаспадара. Як певень, так і конь надзяляліся апатрапейнай сілай. Яны звязваліся ў народных уяўленнях з агнём і вадой, з'яўляліся сімваламі агню. Прыведзеныя даныя сведчаць аб невыпадковым выбары каня і пеўня ў якасці ахвяры пры будаўніцтве дома.

Замена «жывой ахвяры» прадметамі (поўсць, зерне, грошы) адбываецца ў больш позні час. У семантычным сэнсе яны ма-

юць шырокі спектр значэнняў, выступаюць у сваёй «метанімічнай функцыі»: у пэўнай ступені іх змест вызначае семантыку жылля. Поўсць жывёлы з'яўлялася рытуальным сімвалам, які звязаны з такімі паняццямі, як «урадлівасць», «багацце», «дабрабыт». Зерне – гэта ахвярны матэрыял, які распаўсюджаны не толькі ў славян, але і ў іншых народаў. Яно мае ўстойлівую семантыку – «урадлівасць», «багацце». Семантыку папярэдніх двух сімвалаў паўтараюць грошы (манеты). Як паказаў аналіз этнаграфічных крыніц, у Беларусі таксама ў падмурак клалі ладан, асвячоныя зёлкі ці хвойныя галінкі.

Нейтралізацыі небяспечнай семантыкі неасвоенага жылля былі прысвечаны спецыяльныя абрады. Перш чым перайсці ў новае жыллё, яго неабходна было выпрабаваць. З гэтай мэтай пускалі пеўня, курыцу альбо кошку і па іх паводзінах меркавалі аб новым доме. Па звестках П. В. Шэйна, «перш чым зайсці ў хату, пускалі пеўня і чакалі, заспявае ці не, калі хутка заспявае, то ў новым доме будуць жыць весела, а калі – не, то наадварот» .

У міфалагічным плане засяленне новага дома – гэта аналаг засялення света жывымі істотамі ў такой самай паслядоўнасці: жывёлы – людзі. Некаторыя беларускія даныя дазваляюць суаднесці сам працэс перасялення з сяміэтапнай схемай стварэння Сусвету: у першы дзень пускалі на ноч праз акно пеўня ці курыцу, на другую ноч – гуся ці ката, на трэцюю – парася, на чацвёртую – авечку, на пятую – карову, на шостую – каня. Калі ўсе гэтыя жывёлы пераначавалі добра, то запрашалі святара для асвячэння, потым ужо, на сёмую ноч, пераходзіла ўся сям'я. Такім чынам, засяленне адбывалася ў парадку ўзрастаючай рытуальнай каштоўнасці: певень (курыца) – кот (кошка) – парася – авечка – карова – конь – чалавек.

Такім чынам, відавочна, што спіс жывёл, якіх пускаюць у новы дом, перш чым заселіцца чалавек, супадае са спісам жывёл, якія выкарыстоўваліся ў якасці будаўнічай ахвяры. Жывёла, якую заганялі ў дом, выконвала ролю рытуальнага двайніка чалавека, таму што было распаўсюджана павер'е: хто першы заходзіць у новы дом, той першы і памрэ. Запаўненне ўнутранай прасторы новага дома – аналаг запаўнення свету рэчамі пасля яго стварэння. Звяртаюць на сябе ўвагу такія ахвярныя прадметы, як воўна, зерне і грошы. Іх можна патлумачыць як метанімію трох сусветаў: жывёльнага, расліннага і чалавечага.

1. *Афанасьев, А. Н.* Поэтические воззрения славян на природу: опыт сравнительного изучения славянских преданий и верований в связи с мифическими сказаниями других родственных народов : в 3 т. / А. Н. Афанасьев. – М. : Изд. К. Солдатенкова, 1865–1869. – Т. 2. – 1868. – 800 с.

2. *Геннеп, Арнольд ван.* Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов : пер. с фр. / А. ван Геннеп. – М. : Восточная литература, 1999. – 198 с.

3. *Зеленин, Д. К.* Строительная жертва / Д. К. Зеленин // Избранные труды. Статьи по духовной культуре 1934–1954. – М., 2004. – С. 145–175.

4. *Зеленин, Д. К.* Тотемы-деревья в сказаниях и обрядах европейских народов / Д. К. Зеленин. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1937. – 78 с. – (Труды Института антропологии, этнографии и археологии / АН СССР ; т. 15, вып. 2).

5. Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / редкол.: С. А. Токарев (гл. ред.) [и др.]. – М. : Сов. энцикл., 1987–1988. – Т. 1 : А–К. – 1987. – 671 с. ; Т. 2 : К–Я. – 1988. – 719 с.

6. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, северные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. типолитогр., 1897. – 307 с.

7. *Нікольскі, М. М.* Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства / М. М. Нікольскі ; адк. рэд. П. Ізох. – Мінск : [б. в.], 1933. – 136 с.

УДК 378.016:[785+780.8]

***О. А. Немцева,***

*кандидат искусствоведения, доцент,*
*заведующий кафедрой народно-инструментальной музыки*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», г. Минск, Беларусь*

# СПЕЦИАЛЬНОСТЬ «МУЗЫКАЛЬНОЕ НАРОДНОЕ ИНСТРУМЕНТАЛЬНОЕ ТВОРЧЕСТВО»: ОСОБЕННОСТИ ПРОЕКТИРОВАНИЯ И СОДЕРЖАНИЕ ПРИМЕРНОГО УЧЕБНОГО ПЛАНА

**Аннотация.** Осуществляется проектирование учебного плана специальности «музыкальное народное инструментальное творчество», которая будет содержать три профиля подготовки: «инструментальная музыка народная», «инструментальная музыка духовая» и «духовые инструменты народные». Образовательная деятельность по данным